МАЯК

№ 3

АПАВЯДАНЬНІ



КУЗЬМА ЧОРНЫ

№ 3 КНІЖНІЦА „МАЛАДНЯК“ № 3

КУЗЬМА ЧОРНЫ

АПАВЯДАНЬНІ

ВЫДАНЬНЕ ЦБ МАЛАДНЯКА
МЕНСК—1925

1-я Дзяр. друк. Зак.№ 3179—1500 экз. Галоўлітбел № 8885.

БЫЛЬНІКАВЫ МЕЖЫ.

I.

Азалаціла восень поле іржышчам, дрэвы лісьцем, гумна снапамі; абвеяла хаты жытнім пылам; вострым пахам кастрыцы напоўніла вуліцу...

Кароткімі днямі хутка пабегла жыцьцё ў вечнасьць. Аднолькова яснымі нараджаліся яны, гэтыя дні, і такімі-ж гасьлі, і на зьмену ім прыходзілі доўгія асеньнія ночы—то туманныя, то зорныя, з вострым халадком першых замаразкаў...

Дзень пры дні стагнаў ток пад Паўлавым цэпам. Ячменныя асьцюкі з пылам забіваліся яму за каўнер і ў лапці, падала зьверху на яго пыльнае павуценьне, і ён некалькі разоў на дзень выходзіў атрэпацца на двор.

А на двары і вакол было ўсё так, як і дзесяць, дваццаць год таму назад. Таксама плакалі замурзаныя дзеці, абсыпаў вецер пяском трухлявыя сьцены, на пустых агародах панура цягаліся дробныя худыя коні. І той-жа самы стары стук цапоў абуджваў пустое поле. Поле-ж гэтае, яшчэ больш, здаецца, абрасло за апошнія гады густым быльнікам на шыро-

кіх межах, так што здалёк зусім хаваліся ў ім вузкія палосы...

І вытрасаючы мякіну з лапцёў на двары і стукаючы цэпам, Павал не пакідаў думаць.

Гэтыя думкі, цяжкія для яго няпрывычнай галавы, блытаныя, як павуценьне, пачалі зьяўляцца ў Паўла патроху і няпрыкметна за апошнія часы...

Прыяжджалі раз людзі з гораду, тры дні былі ў вёсцы і адзін з іх дзьве ночы начаваў у Паўлавай хаце.

Былі тады два сходы ў вёсцы і мала хто хадзіў на іх—не хацелі слухаць „гарадзкіх абармотаў“, сьмяяліся над імі.

— Гэ-э!—гаварылі,—горад аб‘елі, ўжо тут умацавацца хочуць, харчоў там не хапіла; хітрыя! Па вёсках распаўзацца сталі.

І тыя ўтрох, спатканыя халоднай сьцяной ледзянога недавер‘я бясхітрасных вяскоўцаў, прасядзелі паўдня на гнілых бярьвеньнях у канцы вёскі, не дачакаўшыся сходу. І так разышліся па хатах нанач.

З паўвечара Павал нічога не гаварыў з сваім начлежнікам.

У той дзень зранку хадзіў ён па ральлі і поўныя лапці набілася яму пяску. І цэлы дзень ня меў ён часу высыпаць пясок з лапцёў. Вечарам сьпяшаў зашыць хамут, каб скарэй зрабіць гэта. Каравымі пальцамі перабіраў ён дратву і маўчаў, сагнуўшыся ў кутку.

Начлежнік падышоў к Паўлу.

— Цёмна шыць,—сказаў ён.

— Газы няма,—адказаў панура Павал.

Памаўчаўшы, дадаў;

— У вас там у горадзе газы, пэўна, хоць заліся.

— У нас там электрычнасьць,—адказаў начлежнік і падсеў к Паўлу, як-бы ўзрадаваўшыся гаворцы.

— Ну, вось бачыш,—павярнуўся Павал тварам к начлежніку,—людзям добра, дык яшчэ шукаюць ліха ведае чаго. Цёмная вёска ім патрэбна.

— Загэтым і езьдзім, што цёмная, каб была сьветлая—мала-б мы сюды езьдзілі.

І саўсім раззлаваўся Павал за гэтыя словы —ён зразумеў усё, што хацеў сказаць гэтым яго належнік.

— Што гаварыць дарэмна,—загаварыў Павал,—паслухаеш вашага брата, дык адно й чуеш, што для некага гэта яны усё езьдзяць, для другіх гэта ўсё робяць...

Начлежнік перабіў Паўла:

— Глядзіш ты на мяне так, як-бы нас з табою разьдзяляе каменная сьцяна, а ніякай сьцяны між намі няма. Саўсім ня чужы я табе. Я сам такі самы селянін, як і ты: усяго год, і таго ня будзе, як плуг пакінуў. І цяпер там у вёсцы бацька стары з братам засталіся.

— Чаму-ж ты іх к сабе туды ў горад ня возьмеш, ды пакінуў іх там адных гараваць?

— Што іх браць?! Каб я мог усіх узяць, усю вёску; і ня вёску, а ўсе да аднае вёскі ўзяць, усім зрабіць у адзін дзень добра, тады

можна было-б браць. А то што так браць—аднаму будзе добра, а мільёнам—таксама. Мы йначай „бяром“—у нас другая дарога вызначана. І робім мы ўсё патроху, няпрыкметна зразу. Загэтым мала хто бачыць гэта. Вось ты й гаварыць са мною ня хочаш. На сход сягоньня ні адзін ня прышоў. А мы не апускаем рук, бо йначай нічога ня будзе, зразу нельга зрабіць...

Тады Павал апусьціў хамут з кален на зямлю і слухаў:

—... Ты думаеш я ня ведаю, чаму ты са мною гаварыць ня хочаш, чаму ніхто сягоньня ня прышоў на сход слухаць нас? Я сам—гэта ты, і ўсё я ведаю. Рос я так, як і ты, як і ўсякі той, хто потым робіцца мужыком. З шасьцёх год—ня можа ён ужо расьці на волі, а бярэцца за работу. Гаварыць яшчэ не навучыцца, а ўжо з пугаю па полі бегае. Уварвецца ў засеў скаціна, а сусед зловіць яго, ды натрасе за вушы. Дзіця—ногі у яго папрабіваты іржышчам, раны залеплены зямлёю і ён з плачам пабяжыць кульгаючы па полі. А раніцаю ён як няжывы сьпіць, набегаўшыся за дзень. Сонца яшчэ ня ўзышло, а ты яго цягнеш з пасьцелі. Усхваціцца ён сонны, вочы заплюшчаны, і зноў кінецца, а ты зноў валачэш, сьцягаеш яго з пасьцелі. Здаецца, стаў-бы тады перад ім на калені: на, забі мяне, гада, за ўсё гэтае. А што ты вінават? Таксама, як і ён. Вінавата жыцьцё і зьмяніць яго трэба. Вось чаму пакінуў я свой

плуг, адчуўшы, што больш так магу зрабіць, не для сабе, а для ўсіх.

— Ды ты на мяне ня злуй,—сказаў Павал,—што я ведаю?!.

У тую ноч да трэціх пэўняў гаварыў Павал з начлежнікам, а з другога дню пачаў разьбіраць паволі пакінутыя начлежнікам кніжкі.

Пашлі па вёсцы гаворкі, гадзінай зашыпела ненавісьць тых, хто лічыў раней Паўла „спакойным чалавекам“, і Павал яшчэ больш стаў маўклівым, больш яшчэ стаў думаць.

Увосень пачаў ён сьпешна дамалочваць снапы.

І недзе ў глыбіні, на граніцы пачуцьцяў і думак зьяўлялася яго:

— Пустыя палі, паросшыя дзікім быльнікам на шырокіх межах, пахавалі ў сваім абшары глухія вёскі, закідалі яны іх саломай шчуплых снапоў і за гэты скупы дар загулялі нам імі: у доўгія цёмныя ночы пераклікаліся палі над вёскамі галодным воўчым выцьцём, накладалі на людзей баязьлівую пакорнасьць, нараджалі іх цяжкаю працаю, адбіралі для яе ўвесь час, губілі ў сябе ўсю сьвядомасьць, занесеную сюды часам з буйных гарадоў. І яшчэ адбіралі ў сваіх ціхіх людзей здароўе, так, як і вочы, ад цёмнага сьвету сваіх курных газьнічак...

Усё так-жа дробна і гулка стукалі цапы па гумнах і здавалася, што з кожным сваім ударам, яны ўсё глыбей уваходзяць у жыць-

цё вёскі, як-бы задумаўшы заглушыць сабою ўсе яе іншыя зыкі—так многа дзён яны зычэлі. І толькі ў адным канцы вёскі, адна-адзінютка гула малатарня, але не магла яна адна заглушыць тут стуку цапоў. Яшчэ на цёмную вуліцу з маленькіх вокан падалі палосы ад дасьветных агнёў, а цапы ўжо пачалі сыпаць дробным гарохам. Раней за ўсіх пачынаў стукаць цэп у Паўлавым гумне.

— Павал нешта задумаў—ішла па вёсцы гутарка, а ў Паўла, пад стук цэпу, сьпела адна думка.

І загэтым, як пасьля змроку аблягала вёску воўчае выцьцё і заціхаў стук цапоў, у Паўлавай хаце, вакол газоўкі па цэлых ночах сядзела некалькі чалавек...

Вакол дрыматнаю рэчкаю плыло жыцьцё трухлявых хат. Замаразкамі курыліся кусты сіненькім дымком і вецер прыносіў адтуль к хатам самагонны дух і тады-ж мацней яшчэ пачалі выць зусім блізка начамі ваўкі...

У сьвятыя дні выходзілі людзі на вуліцу. Нескончоныя і вялыя вяліся цэлымі днямі гаворкі і так не гарманізаваў з імі ўвесь выгляд залатой восені.

Так і праходзіў ціхенька дзень.

А то часам пілікне дзе-небудзь за вуглом скрыпка і ўся вуліца рынецца туды. Пад няхітрую музыку аднае скрыпкі і часам двух барабанаў, віхрам выконваецца танец—той танец, які адбываўся ў вясёлыя мінуты ста-

годзьдзі таму назад, а ў больш прымітыўным выглядзе—назад цэлыя тысячагодзьдзі

І хоць стаяць тут людзі, сьцяною налёгшы адзін на другога. але ў кожнага ў галаве блытаецца думка ад пакінутай працы.

Прымітыўнае вясельле ціхіх людзей не пералятае сваімі зыкамі далей саломенных стрэх. Тут-жа й гінуць пісклівыя зыкі скрыпкі за родным вуглом.

А пустое поле вакол і знаць ня хоча людзкога вясельля—яго, зыкі гінуць, у ім. Абросшае дзікім быльнікам, яно ціха дрэмле ўсім сваім бязьмерным абшарам. Вясковыя шумы яно перамагае сваім начным выцьцём ваўкоў, яго-ж цішыню, нават зыкамі свайго вясельля, перамагчы людзі ня могуць.

II.

У адзін дзень засыпаў сівер мёрзлым пылам трухлявыя хаты, апусьцеўшае поле захмурнела высахшым быльнікам на разросшыхся межах, сівыя платы мёрзлі й туліліся да бярвеньняў старых будынкаў.

Па цёмных хлявох корпаліся ў кастрыцы людзі, маўчалі, здаваліся поўнымі думак, але думак ня мелі. Аб чым могуць думаць яны?

Толькі нейкая баязьлівасьць вызначалася ў іх. Так напрытульна ў полі так дзіка—шумна і холадна. І здаецца, што вось прыдзе нехта суровы, насьмешліва тупне нагою і зробіць нейкае зло. Вось чаму людзі так акурат-

на саломка за саломкаю, дубец за дубцом, складвалі й зьбіралі сваю мураўную маемасьць: „калі ўсё будзе ў парадку, ня такая віна мая будзе вялікая“.

А ў чым і якая віна?

А былі калі разумныя думкі аб гэтым?!.

За ваколіцай на пыльнай дарозе буян-вецер скручваўся ў жмут, дакачваўся стралой да крайняе хаты, узьбягаў па сьцяне й кідаўся на яе старую віхрастую голаў. Яна баранілася саломеным крыкам і такі-ж крык узьнімалі суседнія стрэхі.

Гэта быльнікава поле „гуляла“ над вёскай. І ў той дзень вецер ня сьціх, але зрабілася так, што раптам стаў няпрыметным; стала раптам так, што сьвісту яго ніхто не пачуў:

Нешта шырокае рванулася за ваколіцай, шэра-жоўтым ліўнем зыкаў секанула; заглушыла вецер, павыкідала людзей з цёмных хлявоў, парушыла іх „баязьлівы парадак“.

Сотні вачэй бачылі:

Па пыльнай дарозе, к вёсцы, ішоў запылены чалавек, узьняўшы руку ўгору, за ім—шэрая сьцяна, з меднымі сонцамі труб, за трубамі несканчоны лес востраверхіх шапак.

З труб вылівалася—туга-звонкае, срэбнае. І як запылены чалавек махнуў уніз рукою, рванулася яно віхурай, затапіла ўвесь сьвет, заскакала па саломеных стрэхах і саўсім ня чуваць стала ветру. З вуліцы пераскочыла яно праз саломеныя страхі, пераляцела

цераз поле і там загаварыла. І вось, пераскокваючы цераз быльнікавыя межы, прыбеглі людзі за некалькі вёрст...

У вуліцы зьнялі музыканты свае трубы з плеч, разьнясьлі па хатах і асеньні вечар грануў чырвонаармейскімі песьнямі.

У той дзень, хто бачыў запыленага чалавека, ад маху рукі якога рванулася з медных труб нячуванае вясельле, радаснае захапленьне, пакрыўшае поле, у тых, у глыбіні пачуцьцяў, несьвядома зьявілася:

З тэй сілай, якая адчуваецца у ва ўсім гэтым, можна прайсьці ўсю зямлю, перад ёю заціхаюць вятры, робіцца нядужнай прастора адзічэлых палёў...

У той вечар у Паўлавай хаце, вакол цьмянай газоўкі, сядзела за поўнач ня шэсьць, а восем чалавек, і два былі ў востраверхіх, чырвонаармейскіх шапках.

Ніякіх гутарак пра начное пасяджэньне ў Паўлавай хаце на вёсцы ня было.

Людзі думалі, як гэта пачулі музыку за некалькі вёрст за кустамі, цераз усё поле, як гэта перамаглі людзі зыкамі поле ў час яго бурнага шуму...

Назаўтра пашлі чырвонаармейцы з вёскі далей—раптам згінулі так, як і зьявіліся.

Асталося тады ў вёсцы вось што:

Вясковы скрыпач—Амелька зьняў паволі са сьцяны сваю скрыпку, пілікнуў два разы па ёй смыкам, стукнуў у яе пальцам, прылажыў к ёй вуха, паслухаў і вышаў у сенцы.

У раздум'і пастаў ён хвіліну і палез на гару. І там выбраў самы цёмны кут і закінуў у яго сваю скрыпку.

А Павал выцягнуў з паліцы кніжку і нашоў у ёй адрас свайго былога начлежніка.

У яго-ж паперах зьявіўся новы запісі:

— „Зусім зьнішчыць быльнікавы межы“...

У наступныя ночы ў Паўлавай хаце многа гаварылі над гэтым запісам. Многа раз зьбіраліся яго выкасаваць. І можа сапраўды выкасуюць. І не адзін раз можа будуць яго зноў запісваць, і не адзін раз можа зноў выкасоўваць.

Няважна.

Важна тое, што ўласнаю рукою, ад уласнай сьвядомасьці, ён раз ужо быў утваран, гэты запіс.

У наступныя ночы зноў галасілі ў быльнікавых межах ваўкі; у наступныя дні зноў падымаў вецер саломены крык на віхрастай галаве вёскі.

Няважна.

Важна тое, што ў віхрастай галаве ёсьць веда:

— „На сьвеце існуе тое, чалавекам створанае, чым можна заглушыць воўчыя галасы ў быльнікавых межах і саломены крык вёскі, пад ударамі буйнага ветру.

МЯШЧАНЕ Ў ГУСТОЙ ПАРЫ.

Дзядзя Стафанковіч пачухаў распараны жывот, шырока растапырыў ногі і ўзьліў сабе на голаў ражку цёплай вады.

— Ах, здорава; як маслам па нырках,— сказаў ён весела і з філёзофскім выглядам стаў намыльваць сваю жоўтую шыю.

Каб спрытней зрабіць гэтую опэрацыю, прышлося задраць голаў угору, ад чаго, на верхніх палатках, у гарачых хмарах густое пары, дзядзя Стафанковіч убачыў нешта шырокае і круглае, чырвонага колеру і буйнага складу.

— Ці ня парыцца гэта хто на верхніх палатках,—падумаў дзядзя Стафанковіч і стаў пільна ўглядацца.

— Але як ён можа там вытрымаць, у самай гары,—думаў ён, прыглядаючыся, — гэта-ж трэба мець нечалавечую голаў, каб высядзець у гэтакай пякельнай моцы, як у яго там шкура, разам з валасамі, не аблезе?..

Дзядзя Стафанковіч, ахвачаны цікавасьцю, падняўся па ўсходах трохі вышэй да верхніх палатак і зразу пазнаў свайго знаёмага— быўшага штабс-капітана пяхотнага палка— Яўсьцігнея Сьвірыдавіча Разьнюхайліна.

— А-а-а, Яўсьцігней Сьвірыдавіч! — зацягнуў дзядзя Стафанковіч радасна, — а я гляджу, што гэта там такое чырвонае, аж гэта вы. Ну, якжа маецеся?

Разьнюхайлін быў у гэты час заняты зьдзьмуханьнем мутных кропел вады з сваіх пруткіх вусоў. Скрозь пару ён уставіў свае круглыя вочы на Стафанковіча і густым басам адчаканіў:

— Можна сказаць жывём і хлеб жуём, мірна дні свае дажываем. Як гэта даўней, у нас у палку сьпявалі: „Агонь запалю, буду піць, не мяшала-б сабаку купіць!“ — Толькі і ўсяго.

— Толькі і ўсяго, — трагічна паўтарыў дзядзя Стафанковіч і, зьбіраючыся сказаць нешта больш важнае і як-бы сакрэтнае, агледзяў усю баню, з выглядам вельмі тонкага політыка.

Народу мылася мала. Каля дзьвярэй некалькі старэнькіх дзядкоў няміласэрдна церлі адзін аднаму рагожамі худыя сьпіны, трохі далей скроб пад пахамі нехта высокі і тонкі як сьпічак. На ніжэйшых палатках парылася двое. Адзін ляжаў сьпінаю ўгору, другі хвастаў яго распараным венікам. А той варочаўся пад венікам, як япрук, і ўсё камадваў:

— А та-та-та! Д-давай, давай, давай! Каля лапатак наярвай, кажу табе!

Тут-жа, побач, мыліўся Макей Філатавіч Валакіткін — быўшы начальнік нейкай губэрскай канцылярыі, а цяпер рэгістратар высту-

паючых папераў у нейкім бумтрэсьце (ці можа ў табактрэсьце, хто яго акуратна даведаецца). Больш у лазьні нікого ня было.

Агледзіўшы ўсю гэтую кампанію, дзядзя Стафанковіч зрабіў „уміліцельны“ твар і ціха загаварыў, паглядаючы на Разьнюхайліна:

— Справядліва замецілі, Яўсьцігней Сьвірыдавіч, што „толькі і ўсяго“. Чалавек я, можна сказаць, такі, што, як кажуць, хлеб соль еш, а праўду рэж. І калі дзе што якое адным словам, дык я тут-жа, на месцы, гэтае, й больш нічога. Вось гляньце хоць-бы на гэтую лазьню. Ды ў мяне на Нямізе дом, на Ляхаўцы дом і на Серабранцы дом. А гэта значыць, што я тры дамы маю. А раз я тры дамы маю—значыць, я чалавек, а не які небудзь пасьсвісцёл. І даўней, верце маёй совесьці, што я тут вось мыюся, а на сэрцы ў мяне ўжо йначай мыецца. Што з мяне лазьня параю выцягне, тое я вярну: заўсёды бывала, пасьля лазьні, як людзі, пойдзем гуртам, ды вып'ем і закусім. Верна, Яўсьцігней Сьвірыдавіч?

— Верна,—адчыканіў з палатак Разьнюхайлін.

— Чалавек я, можна сказаць, Яўсьцігней Сьвірыдавіч, прыблізіцельны. Возьмем вось зноў для прыкладу мяне і, разам са мною, хоць-бы вас. Вы думаеце сягоньняшняя лазьня вельмі нас пацешыць? І нічуць, і ніколі. Яна табе толькі й дасьць карысьці, што гразь з сябе ў ёй абмыеш. Толькі і ўсяго—як вы,

Яўсьцігней Сьвірыдавіч, справядліва замецілі. А дзе ты пасьля яе пад'гэтае? Як ня круці, а пракладзіцца няўдасца. Што ты, з рускаю горькаю разгуляешся? Ды я ўручаю галавою, што вазьмі ты яе кватэрку, ды ўлі дзіцяці ў вочы—нічога ня пашкодзіць, а ня то, што каб гэтае. Вада, й больш нічога, я на яе й глядзець не хачу. Адным словам, згадзіўся сьвет. Гэтак і ўсё.

Такі, херовы сьвет стаў,—бухнуў басам з густое пары, Разьнюхайлін—адным словам, дні свае мірна дажываем, як у балоце...

— І то, скажыце, гаспада,—перабіў раптоўна Разьнюхайліна Валакіткін,—што знаходзяцца малайцы, што гатоў ён табе вочы выдраць, калі скажаш, што усё гэта нятак, як трэба каб было, па палажэньню жыцьця. Я чалавек, можна сказаць, пастароньні ў вашай, гаспада, гаворцы, але, пры ўсёй маёй скромнасьці, ня магу я свайго слова ня ўставіць, асабліва калі гавораць паважаныя, будзем лічыць, людзі. Чалавек я пажылы, можна сказаць, век свой пражыў, а начальскі гонар—словам, ні то, што, каб дзелам, не сакрушыў. І даўней і цяпер. А змаўчаць, калі на тое пашло, усё-ж такі не магу. Адным словам, тут усё справядліва—сьвет ня сьвет, а чорт ведае што. У сьвяшчэнным пісаньні ўсё было наперад сказана й больш нічога.

Высокая фігура дзядзі Стафанковіча ўся была поўна радаснай увагі. Ён аж забыў, што яшчэ ня парыўся і усё стаяў на адным

месцы і ківаў галавою. Разьнюхайлін-жа быў сур‘ёзны. Ён закруціў свае пруткія, намокшыя вусы, падмыліў калені і лёг на бок, а голаў падняў, каб лепш было слухаць.

— Мне хочацца сказаць, як чалавеку шырокіх поглядаў,—гаварыў далей Валакіткін,—што, як я сказаў, у сьвяшчэнным пісаньні ўсё было прадбачана. Паўстане народ на народ, і царства на царства, і сын стане ворагам бацькі роднага...

— Справядліва замячаеце,—уставіў, салодзенькім галаском, дзядзя Стафанковіч.

— Ня толькі справядліва, а дажа-нават чыстая праўда,—загаварыў раптоўна худенькі дзядок каля дзьвярэй, абціраючы мокраю рагожаю намыленыя грудзі,—я-ж кажу, чалавек я просты і богабаязнены. Дзякаваць богу, трыццаць тры гады з палавінаю крамку бакалейную і мучную трымаў і даводзілася мець дзела з людзьмі ўсякіх рангаў і чыноў—пачынаючы старшым чыноўнікам на пошце і канчаючы самым апошнім смаркачом—шаўцоўскім чаляднікам. І што-ж вы думаеце? З практыкі, самай сібірнай практыкі, людзей пазнаў і магу гаварыць цяпер, вокам не маргнуўшы... На што вам што!? Ды ў мяне ўнук у пінаерах. Чуеце?! Уласны мой унук пінаэр. А бацька маўчыць; малы смаркач верх бярэ над бацькам. Ды яжэлі-б гэта, скажам, быў мой ня ўнук, а сын, дык я яго, сукінага сына, так-бы пінаернуў, што ён у мяне хадзіўбы, як падмецены... Гэта жартачкі? Дасьць

бог дзень, людзі адзяюцца, а ён разьдзяецца—усьцягае на сабе нейкія сінія портачкі без калошаў—адна паясьніцца, ды йдзе маршыраваць па вуліцы. Па Захараўскай вуліцы маршыруе, з голымі лыткамі, ў портачках без калошаў, аж усе гізунты відаць. Верце маёй совесьці, справядлівы чалавек, яй-права. І нічога сказаць ня сьмей—маё—кажа,—права. Крыўда слухаць—малое вашанё, а яго ўжо права. Права ўжо нейкае ён, сукін сын, пазнаў! Што вы скажаце на гэтае права?

— Каму права, каму лева,—пачуўся голас з кутка.

Гаварыў высокі і тонкі чалавек, як сьпічак. І няведома, што прымусіла яго сказаць гэтыя два словы,—сказаўшы іх, ён зноў увесь увайшоў у сваё дзела: сеў на лаўку і так, як раней, не зьвяртаючы ні на што й ні на кога увагі, стаў паліваць вадой і шараваць шырокімі далонямі доўгія і худыя ногі. І нічога ня слухаў, ні на кога не глядзеў, маўчаў і мыўся...

Дзядя Стафанковіч, пачуўшы яго чатыры словы, раптам прыціх, прысеў на лаўку, пасьля ўстаў, пасьля зноў сеў і зноў ўстаў. Падумаўшы трохі, паглядзеўшы на высокага і худога чалавека, ён тарапліва махнуў к сабе рукою рэгістратара Валакіткіна і ўдвух палезьлі на верхнія палаткі к Разьнюхайліну. У вялікім узбуджэньні яны ўсе ўтрох пасунуліся ў самы кут і сталі шаптацца.

Першым пачаў дзядя Сстафанковіч.

— Ну браткі, і папалі,—шаптаў ён скоранька, пырскаючы сьлінаю з роту і задыхаючыся ад пары і нэрвовасьці—вось папалі дык папалі, як м'яла ў кісель. Гэта-ж ведаеце хто? Гэта-ж пэўна, камісар які небудзь. Нават я прыпамінаю, як хавалі нябожчыка, вечны пакой, Авар'яна Тофілевіча, дык перад самаю процэсіяй быў ён, дарогу ўпоперак з тоўстым портфэлем перашоў. Здаецца гэта ён быў, так мне ясна памятаецца. А мы тут разьвялі політычныя гаворкі, не разчомаўшы, хто ў нас пад бокам мыецца... Я хоць асьцярожна ўсё гаварыў, а вы, Макей Філатавіч. вельмі глосьня пачалі выказваць думкі свае. У выпадку чаго, дык вы павінны ўзяць віну на сябе, каб цераз вас, часамі, усім нам не пастрадаць.

— Што гэта вы гаворыце,—зашаптаў засердзіўшыся Макей Філатавіч,—што гэта я павінен адказваць за чужыя грахі?!. Ды я, калі вы хочыце, маўчаў увесь час, гэта вы першыя пачалі ўсю гэту музыку, а цяпер на мяне ўзьвярнуць хочаце. Ды я не пагляджу, што ў вас тры дамы, я магу за зьнявагу свае асобы зрабіць што хочаце!..

— Ня лішне злуйце,—ускіпеў дзядзя Стафанковіч,—вы павіны памятаць, што я гаварыў пра політыку ўмеючы, вежліва і далікатна; і за маю політыку ка мне прычапіцца ніхто ня мог. А вы ў нейкае сьвяшчэннае пісаньне зразу ўперліся, як чорт у грэблю, рады што чыстапсалміе на памяць можаце чытаць. Да

я хоць чыстапсалмія на памяць ня ведаю, але перад вамі ўручаю, што не падгаджу. А вы дарэмна злуеце...

Дзядок, у якога ўласны ўнук „пінаер“, пачуўшы шэпты на палатках, зразумеў ўсё і сам палез наверх.

— І то, батракі, ліхое,—перабіў ён дзядзю Стафанковіча,—мыецца, ліха яму, і як-бы нічога ня чуе й ня бачыць, а сам ўсё слухае ды на вус матае.

Так, херовае дзела вышла—грымучым шэптам адчаканіў Разьнюхайлін. Але так нічога не паможа, а трэба павярнуць палітыку ў другі бок.

Макей Філатавіч Валакіткін раптоўна гдсунўся ў куток, пастукаў пальцам па лбу і сказаў:

— Трэба адно к яму падлашчыцца; памыць яго трэба.

— Ваш язык гаворыць мудрасьць,— радасным басам грынуў на ўсю лазьню Разьнюхайлін. І ўсе трое зьлезьлі з палатак.

— Вы, пане Стафанковіч, ня лішне лезьце наперад, бо зноў бяды наробіце,—сказаў важна Валакіткін,—я пачну справа, а вы ўжо пасьля гуртам.

Худы і высокі чалавек, ні аб чым недагадваючыся, мыліў голаў, прыгнуўшыся к лаўцы. Мыльныя рагі цяклі ў яго з галавы па сьпіне.

Валакіткін, расплыўшыся ў шырокую ўхмылку, ціханька падышоў к яму і стаў на пальчыках. Той нічога не запрыкмеціў.

— Кхэ,-кхэ, —уважліва кашлянуў Валакіткін, каб зьвярнуць на сябе ўвагу.

Чалавек падняў вочы і зноў апусьціў.

— Мыла ў вас, товарыш, рагамі па сьпіне пашло. Гэта добра—усю гразь абьесьць.

— На тое яно й мыла, каб ад гразі бараніцца.

— Спавядліва сказалі, таварыш... Кхэ— кхэ... кхэ... кхэ.., Вось ліха на яго, чалавечыя рукі кароткія—усякае месца на сваім целе можаш памыць, а сьпіны вось не дастанеш. Дайце я вам, таварыш сьпіну памыю.

— Я й сам памыю.

— Вам нявыгадна; дайце я. Давайце рагожку.. Просьценька вы мыецеся—рагожкаю.. Прастата—гэта добрачыннасьць. Давайце, таварыш, адно рагожку.

Валакіткін упіліўся ў „рагожку“ і стаў цягнуць к себе. Чалавек не падаваўся. І тут-жа падасьпела дапамога Валакіткіну: справа падскочыў Разьнюхайлін, зьлева дзядзя Стафанковіч. А дзядок не знаходзіў месца, дзе-б уляпіцца і бегаў, як апараны, вакол.

— Што вы маеце да мяне?!..

— Нічога, таварыш, давайце рагожку.

— Ды вось мая рагожка,—вылепетаў дзядок.

— Станавіцеся, таварыщ, ракам, або прыпірайцеся рукамі на лаўку й падстаўляйце сьпіну.

— Ды я не хачу, я сам, я не прашу вас!

— Скромнасьць, таксама, як і прастата, добрачыннасьць. Падстаўляйце сьпіну.

Яны сілаю павярнулі чалавека к сабе сьпінаю і пачалі мыць. Абкацілі вадою, абмылілі нанава і пачалі шараваць. Дзядзя Стафанковіч вадзіў па сьпіне рагожаю, Макей Філатавіч намыльваў, дзядок паліваў вадою, а Разьнюхайлін камандаваў:

— Так так, пабольш мыла кладзі на шыю, вось тут шмаргані, ніжэй, ніжэй; а ты вадою пад лапаткі боўтні, ды толькі не бяры кіпню, каб не апарыць таварыша!..

— Гвалт, людзі ратуйце, пусьцеце, браткі, што я зрабіў вам... А-я-яй!.. Да я на вас заяву падам!!!

Усе ўчатырох адскочылі ад чалавека, а той, зарадаваўшыся вызваленью, кінуўся раптам за дзьверы й пачаў адзявацца.

— Што яму за ліха, ды ён папраўдзе якбы баіцца нас,—паціснуў плячыма дзядзя Стафанковіч

— Нічога не баіцца, а політыку вядзе,— -грунуў басам Разьнюхайлін,—ідзіце хто паглядзіце хто ён такі: ваенны ці штацкі!?

Дзядзя вышаў за дзьверы.

Чалавек, адзеты ўжо ў старыя салдацкія палатаныя порткі, пасьпешна нацягваў на левую нагу парваны бот, увесь запэцканы гразёю і гноем.

Дзядзя атарапеўшы шмыгануў назад.

— Браткі-ж мае, гэта ж абарванец нейкі!

— Ну?!!

— Яйправа!

Усе выскачылі за дзьверы.

— Да вы кто такі?—запытаў Разнюхайлін.

— Я тут служу.

— Па штацкай ці па ваеннай?

— Па штацкай.

— А кім служыце?

— У заежджым доме Гірша Дрэйзіна на Нямізе, дворнікам—гной значыць падчышчаю пасьля коней.

— Фу ты, чорт!

Чалавек пасьпешна схваціў пад паху шапку й жыкетку і баязьліва выскачыў за дьзверы.

Забыўшы абмыць з сябе распараную грязь і мыла, усе ў чатырох сталі адзявацца.

Ня гледзячы адзін на аднаго, моўчкі, па аднаму, сталі выходзіць.

І як выходзячы, дзядзя Стафанковіч вінавата глянуў на Разьнюхайліна, той апусьціў вочы і прабарматаў:

— Так, ядры яго дагары, маржовае дзела вышла.

МАКСІМКА

— Як сабе, браткі, хочаце,—хочаце вязеце, хочаце не. Дзела ваша. А я вам скажу адно: на гэтым тыдні павінны ўсе аддаць начыста першую рату падатку: хто не аддасьць, будзе вінават.

Сказаўшы гэта, старшыня сельсавету быў ужо змоўк, але, пачуўшы, як з усіх куткоў раптоўна пачаў узьнімацца густы гул галасоў, ён дадаў.

— Мяне няціскаюць—і я націскаю: маё дзела такое—сказаў і баста.

І тады ўвесь сход раптам загаварыў. На розныя тоны загулі галасы. Чуліся яны ніадно адтуль, дзе, пры цёмным сьвеце лампачкі, густою сьцяною вырысоўваліся кажушкі, халаты, касматыя галовы й шэрыя твары, чуліся яны й з цёмных, неасьвечаных куткоў, дзе і сьцены, і людзі зьліваліся з густым змрокам.

Гаваруноў было многа і гаваруны былі розныя. Адны гаварылі па тэй прычыне, што тэрмін „на гэтым тыдні“ лічылі малым, каб здаць падатак; другія мелі гатовае жыта, й трэба было толькі запрагчы каня й завязьці яго ў горад, але й яны не маўчалі, бо думалі, што ўсякая, якая-б сабе ня была, гаворка дае

якую небудзь карысьць. Трэйція гаварылі проста затым, што ніяк не маглі абыйсьціся, каб не пагаварыць; агулам кажучы, гаварылі яны проста затым, што мелі языкі, і ўмелі сяктак гаварыць.

Нарэшце быў яшчэ адзін сорт гаваруноў. Гэта тыя, якім ад падатку ня было, як кажуць, ні горача ні холадна: дагэтуль яны ня мелі зямлі і атрымалі яе толькі ў гэтым годзе і, загэтым падатку цяпер не давалі. Але, нягледзячы на гэта, некатарыя з іх стараліся гаварыць больш за ўсіх; і няведома дзеля чаго—ці то яны хацелі памагчы каму сваею гаворкаю, ці то даўно не гаварылі й былі рады, што дарваліся да гаворкі

Гаваруном гэткага гатунку быў Міхалка, па вулічнаму прозьвішчу—Сьляпенькі, шчупленькі, вёрткі чалавечак, з чырвоным, як медзь, дробненькім тварыкам, і рыжанькімі вусікамі й бародкаю. Шмыгаючы ў грамадзе, падлазячы мужчынам пад локці, усім замінаючы, ён стараўся ўсіх перашчабятаць, паўтараючы за кожным словам сваю звычайную прыказку—„тымчасам, браткі мае“.

Другім гэтакім гаваруном быў Алесь Маңцівода—чалавек стары, такі самы нізкі, як Міхалка, але таўсьцейшы. Сівая барада яго траслася ад гаворкі і бялелі з пад шапкі-„лахмыткі“ пруткія валасы. Ці то ад старасьці, ці то ад другое якое прычыны, ён заўсёды забываў тое, аб чым пачынаў гаварыць і ўжо не ста-

раўся прыдумаць забытую думку, а пачынаў зразу-ж новую, кончыўшы забытую фразу на сярэдзіне словам „гэтае“. Так, як і Міхалка ён ня думаючы гаварыў усё тое, што лезла на язык, і загэтым гаворка ў абодвых іх выходзіла складна, але ні к сялу, ні к гораду.

Быў яшчэ адзін „практычны“ гаварун, які думаў з свае гаворкі зрабіць сабе карысьць. Гэта быў Клеманс Мікадэмчік. Ён хацеў, каб яго калі небудзь выбралі ў сельсавет, і з усіх сіл сваіх стараўся паказацца ўсім чалавекам „гаваркім, разумным, які можа павясьці ўсякае дзела“. Загэтым ён усюды, дзе толькі можна было, гаварыў бяз канца. Як і большасьць гаваруноў, ён аб сэнсе свае гаворкі ня думаў, а рабіў так, як найлепш рабіць у такіх выпадках—заўседы гаварыў усім у руку...

Усякі гаварун лічыў сваю гаворку вельмі важнай, усякаму задавалася, што калі ён не пагаворыць, дык будзе вялікая бяда і таму, каму даюць падатак, і таму, хто яго дае. Усякі думаў, што яго ўсе слухаюць, але выходзіла так, што ніхто нікога ня слухаў, а гаварыл ўсе.

Толькі адзін старшыня сельсавету не гаварыў. Яно то й яму хацелася пагаварыць, але, як вядома, трудна аднаму чалавеку гаварыць так, каб сотня мужчын была давольна яго гаворкай. Для гэтага трэба мець добрую галаву. Галава-ж у старшыні была, праўда. ня кепская, але-ж і не такая ўжо добрая, каб можна было ўнаравіць цэламу сходу. І ён ці-

ха стаяў каля стала і слухаў, як яму ў руку стараўся гаварыць Клеманс Мікадэмчык. (Ён думаў, што старшыня паможа яму ўлезьці ў сельсавет).

— Яно пэўна,—гаварыў Клеманс,—старшынёва дзела такое—сказаў і баста. Яго націскаюць, і ён націскае. Тут робіцца гэтак: не вязеш—будзеш вінават.

— Павінен абстайваць,—скрозь гул пачуліся Клемансу два словы. Яны прымусілі яго падумаць, што выбіраць у сельсавет будзе не старшыня, а ўсе тыя, што гудуць перад старшынёю й перад ім. І Клеманс раптоўна зьмяніў сваю палітыку: абярнуўся сьпіною к старшыні і загукаў ужо ў руку мужчынам:

— Праўду там кажа, што павінен абстайваць. Нашто-ж цябе й выбіраюць, як не на тое, каб добра ка'аабстайваў. Павінен абстайваць!..

Яго ніхто ня слухаў, але ён крычаў далей:

— Калі не абстайваеш, дык нашто-ж ты ў сельсавеце. Далжон абстайваць за народ!..

— Тымчасам, браткі мае,—шчабятаў у Клеманса пад локцем Міхалка Сьляпенькі,—трэба, кажа, вязьці, бо будзеш вінаваты. Тымчасам, выразна сказана, хто не павязе, дык абвінавацяць. Тымчасам, браткі мае...

— А я... гэтая...—хрыпеў у кутку Алесь Манцівода,—я гэтак сама, слухаю, чую й гэтая... Павінен, добра кажа, гэтая... Бо калі ні гэтая, дык на што-ж ты, гэтая...

— Воўк яго рэж, чуўся з агульнага крыку яшчэ адзін голас,—але чорт яго ведае, ў чым тут вязьці? У калёсах ці ў санях? На дварэ, вунь, ні сьнег ні гразь.

— Тымчасам, браткі мае, добра кажа, ні сьнег, ні гразь—падхваціў Міхалка, перабягаючы ў другі кут.—Тымчасам, браткі мае, чорт яго ведае, як тут вязьці—ні сані, ні калёсы. Па-мойму, тымчасам, браткі мае, пакуль націскаць, дык падумай, каб як гэта яго вязьці ў санях, а не ў калёсах, тымчасам, браткі мае...

Міхалка ахрып і шчабетаў ціха, к таму-ж ён адбегся далёка ад стала, і старшыня ня чуў яго шчэбету. Але каб і чуў, то ўсёроўна была-б адна карысьць, бо як вядома, няма яшчэ пакуль што такога дэкрэту, каб сельсаветы маглі наганяць сьнегавыя хмары.

— Яны адно і ўмеюць камандваць ды націскаць,—гукаў Алесь Манцівода.—Я-ж кажу, апрача гэтага больш нічога й ня гэтае. Адно камандуюць ды таўстеюць. Распухне, падла, як бочка, раскорміцца дый гэтае. (Старшыня быў худы і тонкі, як цьвік).—Я-ж кажу, усякі, ліха яму выгадуе чэрава ўсёроўна як той нябожчык, вечны пакой, адвакат Альфіровіч—за дзень не абяжыш, ні то што, каб гэтая... (Ён думай, што некага там, вечны пакой, адваката Альфіровіча знае ўвесь сьвет).

А старшыня стаяў і маўчаў. Ён знаў, што ўсе гэтыя людзі на гэтым тыдні здадуць свой

падатак і потым будуць весела ўспамінаць, як вазілі яго гуртам у горад. Ён знаў, што ня могуць людзі не гаварыць, сабраўшыся вялікаю грамадою. А як лепш гаварыць, калі ніхто з гаваруноў за сваё жыцьцё нічога ніколі ня бачыў, апрача саломы, плуга ды воза...

І сход доўга гуў у чатырох цёмных сьценах, на самым краю вёскі. Даўно ўжо сьцямнела на дварэ, даўно ўжо пакінулі скрыпець калодзезі на гразкай, чорнай вуліцы, а мужчыны ўсё ня йшлі дадому. Што рабіць у нуднай хаце ў доўгі асеньні вечар?

II.

У тую пару, як сход шумеў у густым змроку асеньняга вечару, міма праходзіў Максім Нагорны. Затое, што быў ён малога росту і шчуплы, усе звалі яго—Максімка. Худы твар яго быў бела-жоўты і заўсёды абросшы рэдкімі валасамі: Максімка брыўся ўсяго разоў тры на год, бо „займацца гэтым глупствам часьцей ня меў часу“. Па гэтай прычыне й валасы на яго галаве задсёды кудлачыліся з пад парванае шапкі, ніжэй вушэй.

Нёс ён пад пахаю, ад шаўца з суседняе вёскі, свае старыя боты з новымі латкамі. Праходзячы ў канцы вуліцы міма „зборні“, у якой і даўней і цяпер зьбіраліся сходы, Максімка стаў, каб паслухаць, чаго там народ шуміць.

У той-жа час іншыя ўжо пачалі разыходзіцца са сходу, каму надаела пераліваць з

пустога ў парожняе. У цемнаце чутно было на вуліцы, як калі-ні-калі адчыняліся скрыпучыя дзьверы, як, грукаючы ботамі, выходзілі на ганак людзі.

— А, браткі-ж мае, — гаварыў часам „дзядзька“, спускаючыся з мокрага ганку,— вось цемрыва, хоць на воўка ўссунься, а-я-яй!

— Страшэнная моц,—адказвалі аднекуль з цемнаты, і ўслед за тым пары тры ботаў пачыналі мясіць грязь са сьнегам на мокрай вуліцы.

Максімка пастаяў каля плоту, выждаў, як нікога ня было на ганку, і палез на яго. Потым патупаў трохі ў сенцах, раздумваючы— ісьці ці не. Рашыў зайсьці і, абмацаўшы клямку, пацягнуў к сабе. Дзьверы скрыпнулі й адчыніліся.

Гаваруны яшчэ не пакінулі гаварыць. Праўда, гаворка была трохі іншая і вялася яна ўжо трохі йначай. Міхалка Сьляпенькі ўжо ня так шпарка перабягаў з кутка ў куток, а Алесь Манцівода саўсім ўжо маўчаў і нешта думаў, ці можа драмаў, стоячы адзін, пасярод памяшканьня, наодшыбі ад усіх. Галава яго апусьцілася ўніз, сівенькая бародка ўперлася ў грудзі, ад чаго ён прыняў выгляд старэнькага казла, задумаўшага на старасьці год бароцца.

Гаваруны гаварылі ўжо ня толькі аб падатку, але й аб многім іншым, што каму лезла ў галаў. У адным кутку гаварылі аб тым, ці ня грэх гэта местачковаму папу ад таго, што

ён стаў насіць галіфэ й валсы астрыг, у другім кутку гаварылі, ці могуць ад чорнае кабылы пайсьці сівыя коні ў „яблыкі“. Трэція злавалі адзін на аднаго, вырашаючы вельмі важнае пытаньне—ці можа быць добрая самагонка з таго жыта, ў якім многа „гірсы“. А яшчэ ў аднэй кучы, каля самых дзьвярэй, нехта высокі й лахматы, размахваючы рукамі й ківаючы на ўсе бакі галавою, расказваў, як ехаў ён адзін раз з Дзярэчына да Лешні й згубіў затычку з восі, і загэтым тры разы ў яго скідалася калясо. Гэтую „гісторыю“ можна было расказаць у пяцёх словах, а ён ужо больш за гадзіну гаварыў і яшчэ ўсё не падыходзіў к канцу. Яго слухачы моцна пазяхалі й гаварылі між сабою аб тым, колькі званоў на Цімкаўскай званіцы—пяць ці чатыры. Усім ужо надаелі „сталыя“ гаворкі і хацелася чаго-небудзь жывога, хоць-бы каго паскубці або пакрычаць. Як заскрыпелі дзьверы і ўсьлед затым паказаўся Максімка з ботамі пад пахаю, некалькі галасоў зразу гукнула:

— Але-ж Максімка трапляе заўсёды якраз упору.

Міхалка ўвесь страпянуўся ад радасьці, падбег да Максімкі і залепятаў:

— Добра ка‘а якраз упору трапіў; ха-ха-ха, якраз явіўся на разбор шапак; прышоў, тымчасам, браткі мае, у сьвінныя галасы.

— А я гэтая,—абазваўся Алесь Манцівода, праціраючы заспаныя вочы,—я-ж кажу, усякі

ўсё на гатовае спадзяецца й гэтае. Няма, каб прышоў памагчы дзела рашаць, дык не, хай нехта, так як-бы яму нічога й ня гэтая...

— От, ішоў ды зашоў,—вінавата адказаў Максімка, ня ведаючы, дзе яму дзецца.

— Тымчасам, браткі мае, ён, як верабей—прэцца на бляск,—вылепятаў Міхалка і давольны сабою азірнуўся.

Ён быў рад, што дарваўся да новае тэмы. Ды й многія, няведама чаго, былі рады, так як-бы Максімка прынёс ім прычыну для вясёласьці. Знашоўся нават адзін, што, сам ня ведаючы чаму, закрычаў пад вухам у Максімкі—„ур-ра-а“! І тады ўсе, убачыўшы, што дагаварыліся да пустога канца, пачалі разыходзіцца.

Было ўжо позна. У многіх хатах былі ўжо патушаны агні.

Было ціха, і гучна зычэлі галасы на цёмнай вуліцы й плюхалі па гразі боты і лапці.

І толькі цяпер, па дарозе дадому, Максімка дапытаўся, чаго быў сход. І йдучы ў вялікім гурце, ён думаў, што заўтра трэба будзе дасьвету ўстаць, зьвеяць жыта, бо хто іх ведае, калі ўсе задумаюць вязьці.

— А калі-ж павязом?—запытаў ён у Міхалкі.

Міхалка бойка адказаў:

— Тымчасам, браткі мае, чорт яго ведае. Ты думаеш, народ наш ведае, калі вязьці? Дурны наш народ.

— Але, добра кажаш,—сказаў Алесь Манцівода, пачуўшы, аб чым Міхалка гаварыў з Максімкам,—гэта-ж трэба ведаць, у які дзень вязьці.

— Эй, мужчыны!—загукаў ён на ўсю вуліцу,—калі-ж продналог гэтае?!

— Якое гэтае?

— Калі, азначыць, продналог у горад пагэтае?

— Калі павязом?

— Але.

— А чорт яго ведае; што ты ў мяне пытаеш, пытай ува ўсіх. Эй, р-рабята, у які дзень павязом?

Рабята прыпыніліся і ўжо саўсім загула цёмная, сонная дагэтуль, вуліца. Сход нанава распачаў працу сярод вуліцы ў цёмную ноч. І цяпер ужо выключна гаварылі аб падатку, але толькі на першых часох, пасьля зноў пачалі зьбівацца з гаворкамі ў бакі.

Сталі вырашаць, у які дзень вязьці.

— У панядзелак,—крычалі адны.

— Хто гэта ў панядзелак выбіраецца ў вялікую дарогу, дурны ты. Панядзелак—дзень няшчасьлівы,—гукаў нехта з цемры.

— А нашто нам вельмі ламаць галаву,—пачуўся голас,—не к сабе вязом, а ад сябе. Закажуць, воўк іх рэж.

Нехта яшчэ падаў голас, што трэба пачакаць маладзіка і тады вязьці, але другія яго асьмяялі, закрычаўшы, што гэта сеяць трэба маладзіком, а не вязьці гатовае. І тут-жа па-

чалася гарачая сцрэчка, калі лепш сеяць жыта—маладзіком ці „сходнімі днямі“. Па большасьці галасоў вышла, што ні маладзіком, і—ні „сходнімі днямі“, а „самым поўнам“, але тут сталі падавацца галасы, што гэта „поўнам“ добра ўстаўляць дубэльты ў вокны—макрэць ня будуць. Алесь-жа стаў раптам расказваць, як даўней „Лейба Міхолаў“ павёз у Варшаву вагон цыбулі на продаж і пакуль завёз, дык цыбуля ўся памерзла, і ён зарабіў, „як Заблоцкі на мыле“.

Закончылі сход пеўні, пачаўшы сьпяваць. Як трэба будзе вязьці, то сельсавет закажа— была ўва ўсякага цьвёрдая думка і ўсе весела разышліся па хатах. Некалькі хвілін за імі стукалі дзьверы, ляпалі яны па прымёрзшай зямлі лапцямі й ботамі. У вокнах ясьней заблішчэлі агні, але не надоўга. Скора ўсё пацямнела й заціхла.

III.

На трэйці дзень, пагожаю раніцаю, перад вокнамі ў Максімкавым двары стаяў „Буланчык“, запрэжаны ў драбіны. На драбінах ляжалі два мяшкі з жытам.

Гэтыя мяшкі не давалі яму спакою. Ён бачыў іх праз вакно з свае цёмнае хаты і ўсё думаў. Яго браў страх ад таго, штоён выбіраецца ў горад за сорак вёрст. Чаго яму было страшна, ён сам ніколі ня мог-бы растлумачыць, ён і не разумеў гэтага. Ды ніколі аб гэтым ён і ня думаў. Ён адчуваў гэты страх інстынктыўна, несьвядома.

Каб хто запытаў яго:

— Вернешся ты, Максімка з гораду?

— Вярнуся,—з цьвёрдаю ўпэўненасьцю адказаў-бы Максімка ўва ўсякую мінуту.

— Будешь ты там пакутаваць?

— Не,—абавязкова адказаў-бы Максімка.

— А чаго-ж ты баішся?

— Старшна нек, ліха на яго. Вось які быў-бы пэўны Максімкаў адказ. Усё гэта ён і адчуваў у сабе, паглядаючы праз вакно на свае мяшкі.

Пачало гэта зьяўляцца ў яго з самага сходу. Усе дні ён, корпаючыся каля свайго гумна, сапаволі складаў усё на дварэ ў парадак, саломка за саломкаю, дубец за дубцом.

— Няхай будзе ўсё ў парадку,—думаў ён,— калі хто й гляне, дык за што ён ка мне прычэпіцца, ні ў чым я не вінават. А за што к яму мог хто прычапіцца, ці ў чым яго маглі абвінаваціць—ён ня думаў аб гэтым.

Раней за ўсіх прыгатаваў ён сваё жыта, а калі ў яго пыталі, ці гатоў ён, ён цьверда адказваў:

— Як небудзь трэба гатавацца, каб пасьпець вязьці разам з усімі.

Напярэдадні ад'езду Максімка пашоў на змроку к свайму суседу Тодару, якога лічыў за чалавека сталага, няздольнага да насьмешак над другімі і доўга радзіўся з ім, як выяжджаць. Цэлую гадзіну вырашалі яны ўдвух пытаньне—ці браць на ўсякі выпадак

у воз сакеру (мала што можа здарыцца ў дарозе; часам затычка зломіцца, чым ты новую зробіш?), пагаварылі яшчэ аб горадзе і сваіх адносінах да яго.

Пагаварыўшы з Тодарам, Максімка саўсім быў супакоіўся, але перад самым выездам, раніцаю зноў найшло на яго нешта трывожнае.

І ён загэтым тарапліва, нэрвова адзяваўся, камячыў свой падатковы ліст, хаваючы яго ў кішэню.

Каля яго падскакваў, зазіраў яму ў вочы, сынок яго Піліпка, але ён мала зьвяртаў на яго ўвагі. І толькі раз-по-разу пасылаў яго на вуліцу глядзець, ці не выяжджаюць мужчыны.

— Вось як паедуць як-небудзь ціха, а я астануся,—думаў ён,—вось будзе работы!..

Але Максімка ня мог астацца, каб і хацеў. Такія рэчы ў вёсцы ціха і скора ня робяцца. Яны робяцца трохі йначай, як многія думаюць. Іншаму вольнадумцу здаецца, што няма нічога лягчэй: запрог каня, ускінуў на воз мяшок, сьцебануў каня пугаю й пашоў. Лёгка так думаць, але пайдзі зрабі, паспрабуй. Робіцца ўсё гэта вось як: адзеўшыся, Максімка пабег яшчэ к Тодару. Той саўсім інача глядзеў на ўсю справу. У яго над пачуцьцямі браў перавагу розум. Зьбіраўся ён так: хадзіў па хаце і ўсё разважаў:

— Чаго сьпяшаць—не к сабе павязу, а ад сябе.

— Чаму гэта ня выяжджаюць?—запытаў у яго Максімка.

— Ч-ча... Чаго!. а-а-а...—гукнуў Тодар,— пасьпееш!..Хто гэта дурны сьпяшае з дому.

І Максімка пад Тодаравым уплывам паспакайнеў.

— Буду я адно пільнавацца Тодара,—рашыў цьвёрда Максімка, ідучы назад к свайму возу. І стаў папраўляць хамут на Буланчыку...

На вуліцы чутны былі крыкі:

— Ну, чаму-ж ня выяжджаеш?!—скрыпеў недзе ў двары злосны голас.

— А сам ты што,—адказваў другі голас,— на каго крычыш, а сам? здаецца-ж конь, дзякуй богу!..

— Конь, конь,—агыркваўся першы,—як табе мой конь у вочы коле. Хто табе забараняе добрага каня мець!..

— Ну, выяжджайце там, гэй!—чулася яшчэ з другога боку.

— Выяжджайце там, гэй,—крычаў задзёршы голаў той, да каго кагадзе крычалі.

Максімка выткнуўся на вуліцу.

— Максімка, выяжджай!—гукнула разам некалькі галасоў.

Максімка скоранька шмыгнуў назад у двор.

Галасы не пакідалі глушыць вуліцу.

— Юрась, выяжджай!

— А ты што?!

— У мяне кабыла накульгвае, як-жа я пярэднім паеду!

— А ў мяне конь пудлівы. Хай, калі гэтак, Рыгор першым едзе.

— Уга, як бачыш! Ён ужо Рыгора ўгледзіў,—апраўдваўся Рыгор.

— Эй, ты, чаму ня едзеш?!

— Ну, а ты?!

Цераз некалькі хвілін на вуліцу вышаў з двара хлапец. Ён глянуў управа і ўлева па вуліцы, скрывіў свае брытыя губы ўхмылкай, і, ляпаючы па халявах пужальнем пашоў назад у двор і хутка ўжо выехаў адтуль. Як толькі загрукаў ён калясьмі па мёрзлай зямлі, з усіх двароў рынуліся фурманкі; на вуліцы раптоўна стала шумна і людна. Цмокалі на коняй мужчыны, грукалі й скрыпелі вазы...

IV.

Ссыпны пункт, дзе сяляне здавалі падатак, быў за горадам, пры чыгуначнай станцый. З усяго павету зьяжджаліся сюды сяляне, і загэтым заўсёды тут было людна і шумна. Пусты, пажоўклы выган, заўсёды тут быў зацярушан сенам і саломаю, заўсёды пахла тут пылам ад збожжа і конскім потам і заўсёды чуўся тут гул людзкіх галасоў.

Часам, і вельмі часта, прыяжджала сюды некалькі сот фурманак. Не маглі яны ўсе ў адзін дзень здаць свой падатак і стаялі па некалькі дзён. Тады начамі гарэлі тут агні, чорныя фігуры людзей пры агнёх прымалі фантастычна-грубы выгляд, галасы гулі стрымана, цішэй. Змрок доўгае асеньняе ночы дрыжаў ад агнёў, і калі агні палалі ясьней,

наперадзе смутна пачыналі вырысоўвацца няясныя абрысы гораду.

Раніцаю прыходзілі сюды прыёмшчыкі падатку, і начныя вартаўнікі пакідалі базы. Тады целыя сотні мужчын лезьлі к дзьвярам і тлумачылі адзін перад адным, што ўсе іншыя прыехалі пазьней і толькі іх, некалькі чалавек, даўно ўжо, больш за ўсіх чакаюць. І выходзіла, такім чынам, што ўсякі мае права на тое, каб у яго першага прынялі падатак. Наагул кажучы, усе былі першымі, апошніх ня было—так выходзіла, паглядзеўшы й паслухаўшы ўсяго тут.

У гадзін дзесяць раніцы Максімка пачаў дагаварвацца ў мужчын, каб як гэта начаць здаваць, але Тодар парадзіў.

— Чаго сьпяшаць, не бяром, а аддаем, пасьпеем...

Мужчыны асьмяялі Тодара, і яму прышлося разам з другімі йсьці на ганак базы. Некалькі мужчын праціснуліся ў дзьверы, дзе сядзеў прыёмшчык з паперамі...

— Чаго ты, Тодар, астаўся?—загукалі яны Тодару,—хадзем разам, будзем гаварыць.

— Вось я адно йначай буду рабіць—абазваўся Тодар і падаўся ў бок. Там стаяў стары чалавечак, у кароценькім кафтаніку, падпяразаны вяровачкаю. Дзяржаў ён у руках граблі й мятлу і строіўся зграбаць гной каля баз. Гата быў сторож пры базах. Тодар накіраваўся да яго.

— Каб гэта як-небудзь, таварыш, праднalог гэты самы здаць,—пачаў прасіць Тодар.

Стары адставіў у бок сваю мятлу, важна надзьмуў вусы і сказаў:

— Ды як-небудзь трэба прыняць.

І яшчэ боль надзьмуўся, мусіць, каб паказаць, што й ён тут грае нейкую ролю.

— А дзе здаваць?—запытаў зноў абнадзежаны Тодар.

Стары аўтарытэтна заявіў:

— Гэта бяда адно, што мне трэба якраз ісьці гной зграбаць, а то мы як бачыш-бы...

І, сказаўшы гэта, кашлянуў для важнасьці й запусьціў свае граблі зубамі ў кучу гною. Тодар паволі пашоў назад к ганку.

А там ужо, як у раскіданым муравейніку, усё кішэла й варушылася. Там, дзе важылі жыта, мужчын было, як вады ў поўным збанку. Там крычалі, апраўдваліся, пылілі жытам, паказваючы, што яно бяз пылу, невядома зачым лаяліся адзін з адным... А Максімка ўжо краткаў, коцячы па зямлі перад сабою свой мяшок.

— Ну, й народ—гукаў прыёмшчык—памаглі-б вы яму!

— Дык-жа я сваё зьнімаю,—абазваўся кожны з мужчын,—цяпер-жа мая чарга.

Прыёмшчык насьмешліва гукнуў:

— Дык-жа вы ўжо ўсё ссыпалі!

— А я яшчэ не!

Гэта пракрактаў Тодар, валакучы ўсьлед за Максімкам мяшок.

— Стой, ня сып!—гукнуў прыёмшчык Максімку,—квітанцыі вышлі.

— Я ўжо высыпаў, — вінавата адказаў Максімка.

— Вось табе й раз.

І прыёмшчык напісаў на куску паперы, колькі Максімка здаў жыта, прылажыў да паперы пячаць, даў яе Максімку і сказаў зайсьці па квітанцыю заўтра. Тодар, які адзін яшчэ ня здаў, астаўшыся ад усіх сваіх аднасельцаў, упрасіў прыёмшчыка не пакідаць яго аднаго з жытам назаўтра ад зямлякоў. І прыёмшчык у Максімкавым лісьце прыпісаў Тодарава прозьвішча...

К канцу дня схмурнела, раптам захададала, падуў густы вецер-сівер і хмары коса сяканулі па зямлі сьнегам крупою. Горад нахмурыўся, надуўся і прыціх.

Выган каля ссыпнога пункту пачаў патроху пусьцець: разьяжджаліся, хто здаў падатак, хто ня здаў—шукаў сабе прытулку. Паехалі дадому й аднасельцы Максімкі й Тодара, і толькі яны ўдвух засталіся да заўтрашняга дня. Яны патупалі трохі каля сваіх вазоў, наставілі каўняры ў халатох і сталі зьбірацца ехаць начаваць у горад.

V.

Як толькі пачыналася раніца, ў заежджым доме Гірша Дрэйзіна пачынала крыніцаю біць жыцьцё. Двор тут і павеці заусёды былі перапоўнены балаголскімі вазамі, самі бала-

голы, з бесканцоваю гаворкаю й крыкам, тарапліва шнызалі між сваіх вазоў і на вуліцы каля дому. Яны цягалі на свае вазы з рынку мяшкі солі, скрынкі цьвікоў, запалак, махоркі... Гаспадар дому,—чалавек год пад сорак, вёрткі, астрабароды й хітры, як вужака—пільна сачыў за ўсім тым, што рабілася тут. Лепш за ўсіх ён ведаў, што рабілася і ўва ўсім горадзе. Свайму сябру ён без абмылкі мог сказаць, у якім становішчы грашовыя справы кожнага коопэратыву ў горадзе, добра ведаў, колькі можна ўзяць за карову, або за пуд шэрсьці ці фунт масла ў якім-небудзь мястэчку вёрст за сорак і г. д. Сяляне, якія часта ў яго начавалі, былі ўпэўнены ў тым, што ён ведае „лепш за ўсякага камісара“ ці будзе вайна і, калі будзе, то з кім і калі... Ніколі ён не сядзеў на адным месцы, а ўсё шныраў ад цямна да цямна па ўсякіх крамках, абмацваў на рынку сялянскія вазы, зазываў к сабе начлежнікаў і пры гэтым гаварыў столькі, колькі не гаварылі зараз усе тыя людзі, якіх заўсёды было поўна ў яго ў доме й на двары. Тодар і Максімка, здаючы падатак, бачылі, яго, нават, нечага каля прыёмшчыка падатку. Яны яшчэ ня ведалі, хто ён, але ён зразу кінуўся ім у вочы, як адмятнейшы ад усіх. У яго й прышлося начаваць Максімку й Тодару.

Закрыўшыся каўняром ад ветру, ён падбег да іх перад самым вечарам і закрычаў:

— Зарабіць хочаце ці не?!

— Чаму?—адазваўся Тодар.

— Я ў вас пытаю,—зарабіць хочаце?!

— А ты што за чалавек?—запытаў Максімка.

— Цьфу!—плюнуў той.—Ці я табе патрэбен? Табе грошы мае патрэбны. А я хоць чортам буду—табе ўсёроўна.

— А які заработак?—сказаў Тодар.

— Дык мы-ж не для гэтага прыехалі сюды,—сказаў ціха Максімка.

— А начаваць то трэба вам дзе-небудзь, ці тут будзеце на гэтым скавышы?—насьмешліва гукнуў Гірш Дрэйзін,—у мяне вам будзе і начлег і шмачлег, толькі па возу жыта прывязеце мне з рынку.

Пасьля доўгіх думак Максімка з Тодарам паехалі на рынак. Дрэйзін ускаціўся на Максімкаў воз.

Рынак ужо пусьцеў. Ня было ўжо тут ніводнага сялянскага возу, разыходзіліся з сваімі кашамі гандляркі. І толькі ў адным месцы, проці коопэрацыйнай крамы, стаяла густая кучка народу. Чуўся адтуль сьвіст і музыка. Пакуль Дрэйзін хадзіў спраўляць дзела, Максімка з Тодарам падышлі к кучцы людзей.

Абкружаныя шчыльнай сьцяной гандляроў, дробных рамесьнікаў, павыбягаўшых у сваіх фартухох і бяз шапак, і так нейкіх людзей, кепска адзетых, абшчыпаных, плюгавых, арудавалі тут два музыканты. Адзін, абросшы пруткімі кароткімі валасамі, з макратою пад

вачыма й пасінеўшым носам, у кароткім картовым кафтаніку, круціў шарманку, якая выпускала з сябе нейкі піскліві, наіўна-вясёленькі матыў. Другі, ў доўгім, чорным, аблезлым і парваным пальце, дзяржаў на плячах барабан і, апусьціўшы ўніз, і выверну ўшы руку, біў па ім тонкаю і доўгаю палкаю ў такт шарманцы. Пры барабане была на пружыне медная талерка, ад яе быў праведзен ўніз шнурок і зачэплен чалавеку за абцас. Барабанячы, ён выконваў нейкі просьценькі, зусім прымітыўны, танец і меў вельмі сьмешны выгляд. Ён кружыўся на адным месцы, нявысока падскакваў, стараючыся пацасьці ў такт шарманцы. Ад яго руху шнурок тузаўся й медная талерка бразгала па барабане, не пападаючы ў такт. Час ад часу, стараючыся разьвесяліць сваю публіку, ён выкрыкваў ўсё адно й тое-ж:

-- А я бедны сірата
На сьвеце астаўся—
Маці санкі спаліла
Што з печы спускаўся!

Шарманшчык пачынаў быстрэй вярцець рукою, і скакуну прыходзілася драбней перабіраць нагамі. Тут-жа на зямлі ляжаў адчынены стары чамадан, у які публіка кідала грошы, папяросы, хлеб, яблыкі—што ў каго было.

Максімка пераглянуўся з Тодарам, нечага ухмыльнуўся й пашоў к свайму возу. Разам з Дрэйзіным налажылі яны з Тодарам на

вазы жыта і павязьлі па крывых вуліцах у заежджы дом Дрэйзіна.

Пачынала цямнець.

VI.

У той дзень у Дрэйзіна начавала многа народу. Вялікі начлежніцкі пакой быў запоўнен людзьмі. Сама больш было тут балаголаў, сялян было саўсім мала. Былі тут і так нейкія, невядома якія людзі. Цэлы вечар яны вялі між сабою свае асобныя гаворкі, вырашалі нейкія справы, шапталіся часта з Дрэйзіным, які таксама, як і ўдзень многа бегаў і часта садзіўся за стол лічыць грошы. Нейкія цёмныя, невядомыя людзі, цягалі сюды аднекуль мяса, рыбу, мяшкі з мукою і бяз мукі і многа чаго іншага.

Увесь вечар, ня гледзячы на холад, дзьверы не зачыняліся. Балаголы бесперастанку выходзілі на двор глядзець коняй, хадзілі на кухню, насілі адтуль гуркі, смажаную рыбу і ўсё тое, чым прымала іх гасьцінная Дрэйзінава кухня.

Са столі спускалася ўніз вялікая лямпа. Вакол яе кучкамі цясьніліся людзі, лічачы пры агні грошы, прачытваючы нейкія запіскі, надпісы на нейкіх скрыначках. Ува ўсім пакоі ня было дзе павярнуцца. Усё тут варушылася, крычала, спрачалася, ашуквала адно аднаго, хітрыла адно перад адным, таптала пад ногі ўсё чужое.

І, гледзячы на гэтых клапатлівых людзей, зразу кідалася ў вочы тое, што ўсе яны так

увашлі ў свае гэтыя справы, што, самі таго не замячаючы, лічаць свае справы й сябе цэнтрам усяго жыцьця на зямлі...

Паставіўшы на дворы коні, Максімка й Тодар увайшлі ў хату. І тут гэтая цесната, крык, узбуджаныя твары людзей вярнулі Максімку той страх, які ён адчуваў, выбіраючыся ў горад і які напалавіну страціў за сваімі справамі.

Удвух з Тодарам увайшлі яны ціха, баязьліва азірнуліся вакол, ня выпускаючы з рук пугаў, сталі вачыма шукаць ціхага й цёмнага месца, дзе-б задрамаць. Знайшлі яны такое месца ў самым кутку хаты, каля печы. Там яны разаслалі свае халаты й паселі.

Клапатлівыя людзі пераступалі цераз іх ногі, наступалі на іх халаты і не давалі ім задрамаць. Максімка саўсім скруціўся ў камяк, прытуліўся цесна к печы і ў вачох яго засьвяцілася такое пачуцьцё: „Не чапайце вы мяне, я нават не абзавуся“.

Як ужо саўсім на дворы сьцямнела, сьнежная крупа мацней застукала ў вокны і мацней зашумела ветрам за дзьвярыма. Тады Гірш Дрэйзін разьдзеўся, сеў за стол і пачаў прымаць грошы з начлежнікаў, з кожным таргуючыся і ловячы ўсякага на словах.

Адчыніліся дзьверы і ў хату увашлі два шарманшчыкі, якіх Максімка з Тодарам бачыў на рынку. Яны абодва былі страшна вясёлыя—відаць недзе дасталі выпіць. Весёласьць гэтая нек ня йшла к ім, асабліва к барабан-

шчыку. Ён зразу агледзіў ноўную людзей начлежніцкі пакой і замятусіўся на адным месцы, стараючыся вырабіць нейкі танец. І зноў загукаў добра завучаныя словы:

— А я бедны сірата.
На сьвеце астаўся;
Ух я—я!..

З выглядам чалавека, добра тут знаёмага, шарманшчык расчысьціў свайму сябру—танцору кола сярод хаты й шалёна закруціў шарманку. Пад той самы матыў, які Максімка з Тодарам чулі на рынку, барабаншчык закруціўся на адным месцы. Дрэйзінавы начлежнікі прыціхлі і з вялікаю цікавасьцы застылі шчыльным колам.

Максімка з Тодарам застылі каля свае печы, пазіраючы на гэтую праяву.

— Стой!—крыкнуў шарманшчык, пакідаючы круціць,—цяпер глядзеце вучонага попугая.

Усе, хто толькі тут быў, яшчэ цясьней абкружылі шарманку.

І тады Максімка й Тодар з свайго цёмнага кутка ўбачылі, як барабаншчык неўзаметку выціснуўся з кола, паставіў каля сьцяны барабан, павадзіў па людзях п'яненькімі вачыма й запусьціў руку ў кішэню франтаватага начлежніка, які забыў усё на сьвеце, апрача вучонага папугая.

— А братачка-ж, эй ты!—гукнуў Максімка, раптоўна ўсканчыўшы з свайго месца.

Барабаншчык шмаргануў руку з кішэні, але моцна тузянуў, і начлежнік абярнуўся і ўсё зьмеціў.

— Дзяржы злодея—закрычаў ён.

— Каго, дзе?!..

— Отто-о, браткі, ў кішэні злавіў.

— Ну?!.

— Яй права!

Чалавек дзесяць навалілася на п'янага барабаншчыка. Яго цягалі па хаце, накладалі яму па шыі, а ён маўчаў, як-бы ўпэўнены ў тым, што гэтак яму прыназначана.

І ўжо тады, як яго адпусьцілі, ён, хістаючыся ў бакі, падышоў к сталу.

— Га-аспад-да—сказаў ён п'яненькім, гугнівым галаском,—ці ведаеце вы каго вы білі?

І ён вялічна ўзьняў угору руку.

— Вы білі мяне, а ня ведаеце, хто я. Наце глядзіце!

І ён выхапіў з-за пазухі запэцканную паперу і бразнуў на стол.

Начлежнікі рынуліся к сталу.

Там ужо стаяў Дрэйзін, падняўшы паперу к лямпе.

— Ш-ш-ш,—зашыпеў барабнаншчык, вялічна-трагічным махам рукі сьцішаючы зашумеўшых начлежнікаў.

Пры мёртвай цішы Дрэйзін прачытаў, што дваранін Франц Уманіцкі, па ўказу яго імпэратарскага вялічаства, награджоны мэдалём за ўсьмірэньне сялянскага паўстаньня супроць

памешчыкаў у 1905 годзе, у Ліхасельскай воласьці.

— Гэта я,—тыкаў сябе ў грудзі барабаншык,—вось і мэдаль.

Аб стол бразнула нешта звонкае.

-- Вы ня зналі што рабілі, вы цёмныя, і я црашчаю вас.

І сказаўшы гэта комічна-вялічным голасам, барабаншчык сеў і трагічна паківаў галавою.

—Дык гэта вось што за птушка,—пачуўся з кутка сялянскі голас—вось, што, дваранскае аблічча да чаго дайшло!

Начлежнікі гранулі рогатам і пачалі распаўзацца хто куды. Зноў пачалі ўсе хітрыць адзін, перад адным, старацца ашукаць адзін аднаго. Дрэйзін—сваіх начлежнікаў, начлежнікі яго і адзін аднаго.

П'яны барабаншчык ужо зваліўся на лаўку і нешта хрыпеў п'яна-сонным голасам.

А Дрэйзін ужо ў суседняй каморцы даставаў з цадпалы бутэлькі з „напіткамі". І ужо, хто меў нюх, пашоў туды. Барабаншчык уклаўся спаць на падлозе. Максімка з Тодарам баязьліва сядзелі ў сваім кутку, а ў другім кутку таксама маўчалі некалькі сялян.

Начлежнікі гулі й варушыліся, ляпаючы раз па-разу дзьвярыма.

— А-яй, браткі! а-яй!—пранізаў раптоўна гул галасоў і стук ног праразьлівы голас.

— Што?!

— Каня ўкралі з-пад паветкі.

Максімка з Тадорам інстынктыўна ўсхваціліся і шмыганулі на двор. Рынуліся за імі і ўсе.

Быў страшэнны крык на двары, сьвістаў каля варот міліцыянэр, сяляне лезьлі на свае вазы і ўкладаліся там.

На двары ўжо было ціха. Вецер сьціх, крупа пакінула сыпаць з неба, сьвяціў месяц і сьветла было.

Максімка з свайго воза ясна бачыў двух міліцыянэраў, як яны пашлі ў самую глыбіню двара; перад імі разыходзіліся ў бакі нейкія цёмныя людзі, няведама якія.

— Вось і рабі што хочаш,—сказаў Максімка Тодару з свайго воза.

-- Што?—запытаў міліцыянер, падыходзячы бліжэй.

— Мы бядуем, што начаваць на двары прыходзіцца,—скзаў Тодар.

— А вы хто такія будзеце?—запытаў міліцыянэр.

— Мы сяляне, здавалі падатак.

І мы—сяляне,—абазваліcь яшчэ з другога кутку.

— Дык чаму-ж вы ў доме селяніна не начуеце?

— Мы нічога ня ведаем.

— Вось чудакі. Едзеце зараз-жа, яшчэ сягоньня рана. Вось на трэцяй вуліцы, к канцу гораду.

Саляне хваціліся зацрагаць коні.

І, ужо запрогшы, сталі спрачацца, ці не паехаць саўсім дадому—ноч відная. І парашылі ехаць.

— А вы адкуль?—запытаў у іх Тодар.

— З Церабілаўкі.

— Дык гэта-ж ад нас блізка, разам ехаць, —узрадваўся Тодар. — Ці не паехаць і мне з імі.

— А як-жа я?—запытаў сплохаўшыся Максімка.

— А ты пашукай таго дому селяніна ды пачуй, а заўтра атрымаеш і маю квітанцію ды й прыедзеш.

І Тодару ўдалося ўламаць Максімку. Ён разам в сялянамі паехаў дадому, а Максімка паехаў шукаць дому селяніна.

Ён ехаў па забялеўшых ад сьнегу вуліцах гораду, увесь ахоплены страхам перад горадам, пасьля Дрэйзінавага дому.

— Вось папаўся,—думаў Максімка,—хайбы ты згарэў, каб хаця скарэй скончыць усё ды дабрацца да сваёй вёскі. І чым больш ён ехаў, тым страх перад горадам ў яго ўсё павялічвался. Быў момант, што хацеў ён адцурацца нават сваёй квітанцыі і пусьціцца даганяць Тоадра—абы скарэй з гораду...

У доме селяніна таксама біла крыніцай жыцьцё. Па доўгаму карыдору хадзілі ўзад і ўперад толькі што прыехаўшыя сяляне Направа, за прычыненымі дзьвярыма, ішла для сялян лекцыя.

Максімка паставіў Буланчыка ў хлеў і, йдучы ў дом, рашыў забіцца дзе небудзь у куток, нікому не пападацца на вочы, як небудзь ціхенька перадрамаць ноч і назаўтра скарэй уцякаць з гораду.

У карыдоры запыніў яго сторож;

Спальны пакой яшчэ зачынен; можаш, таварыш, ісьці піць чай або лекцыю слухаць.

Максімка нічога не адказаў. Ён ціха прыпёрся к сьцяне і стаў глядзець, як уваходзілі і выходзілі сяляне.

Ён бачыў, як кучка сялян сабралася каля дзьварэй, за якімі йшла лекцыя, як потым яны адчынілі дзьверы і пачалі па аднаму ўваходзіць туды.

— А, можа, гэта там начаваць будуць? падумаў Максімка і пашоў усьлед за ўсімі.

Ужо лекцыя скончылася. Лектар стаяў на памосьце, вакол яго таўпіліся густа сяляне: яны закідалі лектара пытаньнямі.

Максімка ўбіўся ў кучку шэрых халатаў і чуў, як сяляне сьмела гаварылі з „гарадзкім чалавекам на памосьце“ аб конях, гарадох, палёх... І Максімка стаў прыслухоўвацца й аглядацца. Было тут трошкі накурана, пахла намокшымі суконнымі халатамі, нехта, мусіць, на ботах прынёс сюды пах дзёгцю. І сяляне, хадзілі сьмела, як у сябе дома.

— Саўсім вёска,—мільганула ў Максіміκі, думка і нешта стала зьяўляцца ў ім роднаспакойнае. І стала здавацца яму, што каб глянуць у вакно, то ўбачыш саламяныя стрэ-

хі, мокрыя, паасеньнему, голыя дрэвы, ціхі змрок вясковае ночы ўвосень.

І Максімку нешта пацягнула к вакну. Глянуў ён праз цёмную шыбу з трэцяга паверху ўніз.

За крайнімі вулічкамі, трохі далей, рваў цемнату змрочнае ночы сваімі агнямі горад Узьнімаліся ўверх круглыя электрычныя сонцы, мігацелі й пераліваліся яны роўнымі колерамі—і жоўтымі, і белымі, й чырвонымі, асьвечаныя імі, узьнімаліся высока каменныя сьцены, цяжкія, нярухомыя. А з левага боку, зусім блізка, агні варушыліся, лятаі стрэламі. З гораду чуўся ціхі гул, а адгэтуль звонкія стукі і нейкія магутна-шырокія зыкі глушылі раз по разу ўсё. Пасьля тры зыркія, агнявыя, круглыя вочы вынырнулі аднекуль з сырога зморку палёў і нешта чорнае, жалезнае з крыкам і свістам падкаціла блізка і стала.

Станцыя напоўнілася людмі:

— Горад,—падумаў Максімка і адвярнуўся ад вакна. І над шэраю кучаю сялян убачыў такое-ж самае электрычнае сонца. Яно спускалася са столі і сьвяціла сялянам, якія ўжо бралі з рук лектара некія беленькія кніжачкі разьбіралі па складох.

— Чаго стаіш, ідзі бяры кніжку,—тузянуў Максімку сусед.

— А якая кніжка?

— Пра тое як аглядаць на зіму поле.

— Поле,—зьдзівіўся Максімка, — кажаш поле? Вясковае поле?!

— Хэ хэ! А то якое-ж яшчэ поле бывае!
— А дзе гэтая кніжка друкавалася?
— Ды тут-жа, у горадзе.
— Ну?!

Максімка нясьмела падыйшоў к сталу і ўзяў книіжку. Пакой апусьцеў. Астаўся адзін толькі лектар. Ён зьбіраў з свайго стала нейкія раскіданыя паперы і кніжкі.

На сярэдзіне кніжкі, Максімка ўбачыў малюнак: голыя дзеравы каля хат і на полі арэ чалавек.

Узбуджаны Максімка загарнуў кніжку і падышоў к лектару:

— Дык гэтая, значыць, кніжка друкавалася тут, у горадзе?

— У горадзе. А што?

Максімка мяўся на адным месцы і маўчаў.

— А вы адкуль?

— Ой, здалёку, за сорак вёрст...

Лектар раптоўна кіўнуў к сабе галавою і пашоў. Максімка рушыў за ім.

У кутку дастаў лектар з шафы зьвязак кніжак і даў Максімку.

Максімка паглядзеў на кнігі, потым на „гарадзкую“ электрычнасьць у сябе над галавою. І нешта радаснае затрапяталася—забілася ў ім. І недзе ў глыбіні, на граніцы пачуцьця й думкі, зьявілася ў ім нешта такое:

— У адным горадзе два гарады. Ня знаў я дзе шукаць свайго гораду...

* * *

На другі дзень, папаўдні, выяжджаў Максімка з гораду. На саломе ўперадзе ляжалі абкручаныя мяшком кнігі.

— Эй, ты! Заяжджай, можа начаваць трэба будзе!—закрычаў Гірш Дрэйзін, калі Максімка праяжджаў міма.

— Што, не пазнаў!—хітра адказаў Максімка, —эх ты, галава. Пашоў ты з сваім начлегам!

Выехаўшы ў поле, Максімка азірнуўся на горад, як-бы пакінуўшы ў ім нешта важнае, блізкае.

Адтуль даносіўся гул кіпучага жыцьця.

Радасна і часта аглядаючыся на горад. Максімка пагнаў Буланчыка па мокрай, ад расстаўшага сьнегу, дарозе.

ЗЬМЕСТ

КНІЖНІЦА „МАЛАДНЯК“

ЦБ Усебеларускага Аб'яднаньня поэтаў і пісьменьнікаў Маладняк выдае літаратурна-мастацкія зборнікі (вершы, апавяданьні, крытыка) разьмерам ад аднаго да двух друкаваных аркушаў.

Зборнікі прадаюцца ўва ўсіх лепшых кнігарнях і кіосках Беларусі, а таксама на галоўных станцыях чыгунак, якія праходзяць цераз БССР.

У траўні месяцы 1925 г. вышлі:

1. **Міхась Чарот**—выбраныя вершы.
2. **Ул. Дубоўка**—Там, дзе кіпарысы (*поэма*).
3. **Кузьма Чорны**—апавяданьні
4. **Адам Бабарэка**—апавяданьні.
5. **Язэп Пушча**—Раніца рыкае (*вершы*).
6. **Крапіва**—Асьцё (*сатыры*).
7. **Маладняк — Янку Купалу** (юбілейны зборнік).

У чэрвені выйдзе 7 наступных зборнікаў, а ў ліпені 6.

Цана 20 к.